**Міхно, У.** А на сэрцы – шрамы... / У. Міхно // Лепельскі край. — 2019. — 5 лют. — С. 6.

# А НА СЭРЦЫ – ШРАМЫ...

*Зараз **Уладзіміру Маляўку** каля сямідзесяці год, і ён цяжка хворы чалавек. Сам расказвае, што ўрачы аперацыю на сэрцы рабіць не сталі, але ж прызначылі даволі сур'ёзныя лекі, якія трэба піць увесь час, іначай...*

Пра тое, што будзе іначай, Уладзімір Пятровіч стараецца не думаць, але кожны раз, перш чым спусціцца з пятага паверха сваёй кватэры ў Бароўцы, глытае нітрагліцэрыну, п'е іншыя таблеткі. Так, на ўсялякі выпадак. Жыццё навучыла яго, што лепей лішні раз не рызыкаваць і не жартаваць са смерцю.

А быў жа некалі і малады, і шустры, і здаровы. Бывала, выйдуць з бацькамі і з братам на поле, за лядненскай Слабодкаю, лён ірваць. Ірвалі ўручную. І што ім тыя дзесяць сотак!

У дзяцінстве Валодзя рос працаголікам. Вы скажаце: зразумела, вясковы хлопец, па-іншаму і быць не магло. Яно так, але і ў вёсцы не ўсе аднолькава працавітыя. Валодзю ж навучыў працаваць у Слабадской сярэдняй школе любімы настаўнік Іван Грахольскі. На ўроках працы ў Івана Максімавіча хлопчыкі венікамі не размахвалі, а вучыліся рабіць мужчынскія справы. Настаўнік вучыў дзяцей майстраваць табурэткі, звязваць аконныя рамы, ды ці мала якой справе, што спатрэбіцца затым і ў гаспадарцы. У сям'і расло шасцёра дзяцей, а гаспадарка была вялікая. Узяў сякеру, рубанак – і пайшоў. Дапамагаў бацьку будаваць дом.

Пасля васьмігодкі старэйшы брат падахвочваў паступаць у Суворaўскае вучылішча, ды бацькі не адпусцілі. У гаспадарцы патрэбны быў памочнік. Так і застаўся ля дому. Працаваў качагарам, а давучваўся ў Бароўцы ў вячэрняй школе.

У 1968 годзе прызвалі ў армію. Накіравалі спачатку на курсы спецыялістаў радыёсувязі ў Саратаў, а служыў у горадзе Борзя Чыцінскай вобласці ў Ваенна-паветраных сілах.

Пасля дэмабілізацыі пэўны час працаваў на Лепельскім лінейна-тэхнічным участку сувязі радыётэлефаністам, а затым зноў вярнуўся ў армію, пайшоў служыць па кантракце. У 1975 годзе накіравалі ў Самарканд у школу па падрыхтоўцы прапаршчыкаў, адкуль выйшаў праз год са званнем і правам працаваць на радыёстанцыі А-140. Адкамандзіравалі ў Бароўку, у 76-ю ракетную брыгаду. Кантракты Уладзімір заключаў двойчы – спачатку на пяць гадоў, а затым яшчэ на тры. Другі яго кантракт быў ужо «афганскім».

У ліпені 1981 года прапаршчык Уладзімір Маляўка адбыў у распалажэнне 252-га асобнага батальёна сувязі 201-й мотастралковай дывізіі 40-й арміі ў якасці начальніка радыёстанцыі. Стаяла дывізія ў афганскай правінцыі Кундуз. А літаральна праз тры дні Уладзіміра чакала першае «баявое хрышчэнне». Дзевяцітонная радыёстанцыя базіравалася на машыне ЗІЛ-131. Яе ахову арганізоўвалі таксама дзве БМП. Задача была забяспечыць надзейнай сувяззю камандзіра дывізіі ў ваенна-палявых умовах. Рухаліся калонай, якую яшчэ з неба прыкрывалі верталёты МІ-8 і МІ-24. Так што прыкрыццё было даволі надзейнае, але заўсёды існавала верагоднасць нарвацца на міну, так званую «італьянку», хоць мясцовасць і прачэсвалася старанна сапёрамі. Некаторыя асабліва небяспечныя ўчасткі даводзілася пераадольваць на вялікай хуткасці. Інакш калона станавілася жывой мішэнню для ворага. Напрыклад, у правінцыі Паўночны Баглан хуткасць руху дасягала васьмідзесяці–дзевяноста кіламетраў за гадзіну. На крайні выпадак, для знішчэння радыёстанцыі камандзір У. Маляўка меў выбуховую сумесь і шнур, разлічаны на пятнаццаць секунд гарэння. Пазбегнуць смерці за гэты час было практычна немагчыма. Бог уратаваў, але першая баявая аперацыя заняла прыкладна паўтара месяца. Хапіла ўсяго: непадалёк «духі» ўзарвалі трубаправод, разбілі калону, якая ішла на Кабул. Праўда, і нашым удалося захапіць палонных, якіх пасля абмянялі.

А затым узялі накірунак у цясніну Мармоль, якая ў народзе атрымала назву «цясніна смерці». «Духі» бажыліся, што «шураві» ідуць у нікуды і назад не вернуцца. Калі паступіла каманда зайсці ў цясніну, паперадзе пайшлі афганскія войскі. Пры заходзе наткнуліся на фугас, з «трыццацьчацвёркі» сарвала вежу, і афганская армія вярнулася назад. Аднак ісці трэба было, і нашы павольна, асцярожна рушылі наперад, перыядычна падрываючыся на фугасах і мінах.

У кожнага быў свой лёс. «Духі» стрымалі слова. Пры выхадзе з цясніны нашым прыйшлося не салодка. На вачах Уладзіміра выбухнуў бензавоз, падарвалася і БМП, механіку-вадзіцелю

адарвала ногі. Уладзімір Маляўка вярнуўся з баявой аперацыі цэлым, аднак неўзабаве захварэў на жаўтуху, трапіў у шпіталь у Самарканд. Пасля хваробы меў права вярнуцца ў Саюз, аднак не скарыстаўся ім, застаўся са сваім экіпажам.

Пасля гэтага было яшчэ шмат баявых аперацый. Удзельнічалі ў ліквідацыі фарміраванняў Ахмад-Шаха Масуда ў Пандшэрскай цясніне. Пасля непрацяглага адпачынку, які правёў дома, Уладзімір зноў вярнуўся ў Афганістан, дзе ў правінцыі Кундуз служыў начальнікам зараднай станцыі акумулятарных батарэй. Болей на палявыя аперацыі ўжо не выходзіў. У ліпені 1983 года, пасля трох гадоў службы, урэшце, пакідае Афганістан па замене.

За ўдзел у аперацыі ў Пандшэрскай цясніне яго прадстаўлялі да ўзнагароды ордэнам «За службу Радзіме» III ступені. Аднак дакументы так і не прыйшлі і ўзнагароды не атрымаў. А вось экіпаж камандзіра Маляўкі: памочнік камандзіра радыёстанцыі, вадзіцель, радыст – кожны атрымаў баявыя ўзнагароды – хто «За адвагу», хто «За баявыя заслугі», бо яны ў Пандшэр ішлі сваім ходам.

З Афганістана Уладзімір Маляўка вярнуўся ў Бароўку, дзе служыў да расфарміравання арміі у 1992 годзе. Пасля яшчэ тры гады ўзначальваў рэчавы склад.

Уладзімір Пятровіч даўно ў запасе баявы прапаршчык. Выраслі дзеці, падрастаюць унукі... «Палявыя аперацыі» зараз – толькі за гаражамі, дзе трынаццаць сотак агарода і домік для рыдлёўкі з цяпкаю. А на сэрцы – шрамы інваліда другой групы. Гэта баліць Афганістан!

**Уладзімір МІХНО**